Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 120, 1/13027

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.10.2011 № 487

# ПЛАН
## мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа

| Назва мерапрыемства | Тэрміны выканання | Адказныя за выкананне |
|---|---|---|
| 1. Правядзенне ў месцах і арганізацыях, звязаных з жыццём і творчасцю паэтаў, ва ўстановах культуры і адукацыі ў г. Мінску, абласных і раённых цэнтрах, гарадах, іншых населеных пунктах, а таксама ў замежных установах Рэспублікі Беларусь святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, з прыцягненнем да ўдзелу ў іх вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва, творчай і навуковай інтэлігенцыі рэспублікі | на працягу 2012 года | аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства замежных спраў, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» |
| 2. Стварэнне тэматычных літаратурна-мастацкіх і дакументальна-публіцыстычных праграм па творах Янкі Купалы і Якуба Коласа ці прысвечаных іх жыццю і творчасці | на працягу 2012 года | Міністэрства інфармацыі, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, закрытыя акцыянерныя таварыствы «Другі нацыянальны тэлеканал» і «Сталічнае тэлебачанне», Міністэрства культуры |
| 3. Забеспячэнне выдання друкаванай прадукцыі да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, у тым ліку факсімільнага выдання кніг Янкі Купалы «Шляхам жыцця» і Якуба Коласа «Сымон-музыка», выданне ў серыях «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і «Школьная бібліятэка» кніг, прысвечаных жыццю і творчасці паэтаў, а таксама іх твораў | на працягу 2012 года | Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» |
| 4. Правядзенне рэспубліканскіх свят паэзіі, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа | ліпень, лістапад 2012 г. | Мінскі аблвыканкам, Міністэрства культуры, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» |
| 5. Добраўпарадкаванне тэрыторый гісторыка-культурных аб'ектаў, звязаных з жыццём і творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа, устаноўка інфармацыйных паказальнікаў аб гэтых аб'ектах, правядзенне капітальнага рамонту будынкаў устаноў «Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы» і «Дзяржаўны літаратурны музей Якуба Коласа» | на працягу 2012 года | Міністэрства культуры, Міністэрства ўнутраных спраў, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам |